

У студэнтаў другога курса хімфака наступіла гарачая пара. Перад тым, як здаваць экзамены, ім патрэбна выканаць некалькі лабараторных работ. Наш фотакарэспандэнт А. Кадзет сфатаграфіраваў Свету БАНЬКОЎСКУЮ, Люду КРЭДЗЬКО, Розу ЛЕНЧНЕР і Юру РЭВУ ў час заняткаў па аналітычнай хіміі.

## 5-га СНЕЖНЯ — ДЗЕНЬ САВЕЦКАЙ КАНСТЫТУЦЫІ


Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя Ул. І. ЛЕНІНА

№ 35 (622) Пятніца, 3 снежня 1965 г. Год выдання XVIII Цана 1 кап.


## СЕСІЯ БЛІЗКА! ТЫ ПАДРЫХТАВАЎСЯ ДА ЯЕ?

ГЭТАЕ старое пытанне ўзнікае перад студэнтамі штогод: «Як лепш падрыхтавацца да сесіі!» Праўда, некаторых яно пачынае турбаваць, як сесія ўжо грукне на ўсю ў дзверы. А трэба, каб яно хвалявала з самага пачатку — з верасня, з першага ж дня вучобы, і каб не пакідала цябе «вечна» — на працягу ўсіх пяці гадоў вучобы, аж да атрымання дыплома.

Дык сапраўды: як жа рыхтавацца да сесіі! Што такое падрыхтоўка да яе!

Перш за ўсё трэба сістэматычна наведваць заняткі, старацца з першага ж курса весці падрабязныя канспекты па ўсіх дысцыплінах і, вядома, з любоўю адносіцца да выбранай прафесіі, да ўсіх прадметаў, бо проста немагчыма вылучыць, якія з іх стануць для вас галоўнымі, якія — другараднымі. Вельмі важна, асабліва для тых, хто паступіў ва універсітэт адразу ж пасля школы, з першага курса правільна спланіраваць свой працоўны дзень, нават — нядзелю, аддаючы даніну і для тэатра і кіно. Памятайце, аднак, што ўсё добра ў свой час, што першы абавязак студэнта — вучоба.

Кожны дзень дома трэба працаваць над сваімі канспектамі. Трэба мець як бы папярэдні канспект — запіс лекцыі і канчатковы: перанесенае з папярэдняга канспекта і падручніка з разлікам, каб канчатковы канспект адказваў на ўсе пытанні праграмы (студэнты чамусьці не звяртаюць на яе ўвагі, а ёю карыстацца пры падрыхтоўцы трэба абавязкова!).

Канспект трэба апрацоўваць аператыўна, бо ў першыя два-тры дні лекцыя добра яшчэ памятаецца і яе лёгка перадумаць, трывала ўрэзаць у памяць, а што незразумелае у ёй, тут жа высветліць у выкладчыка, абмеркаваць з сябрамі. Сістэматычная работа з дня ў дзень — вось у чым запарука добрых поспехаў.

Бывае, праўда, і так, што толькі за тры-чатыры дні перад экзаменам студэнт бярэцца за кніжку, і сядзіць над ёй па 14—16 гадзін, каб як-небудзь данесці да стала экзаменатара хоць якія веды. Спіхне такі студэнт экзамен, накідваецца на другі, чытае запоем, і ўся недарэчнасць такой падрыхтоўкі відавочная.

Няма сакрэту — удаецца часам студэнту і пры штурмаўшчыне атрымаць «тройку» ці нават «чацвёрку». Але шкоднасць такой практыкі становіцца зразумелай ужо на другім — асабліва — на трэцім курсе. Тут студэнта чакае сапраўдная катастрофа — яму бракуе элементарнага навуковага фундаменту. Такі гора-студэнт, як правіла, на экзаменах пачынае «плаваць» і кваліфікаванага спецыяліста з яго не чакай.

Наша студэнцтва добра забяспечана навуковай літаратурай, мае багатыя бібліятэкі, кабінеты, лабараторыі. Тым не менш, ужо з першага курса студэнт павінен дбаць аб уласнай бібліятэчцы літаратуры.

За працу трэба садзіцца з добрым настроем, з жаданнем зрабіць шмат, рашыць зададзеныя сабе пытанні. З цягам часу гэта стане звычкай і нават самая напружаная праца стане прыемнай, неабходнай на ўсё жыццё. Толькі з гэтым прыходзяць адкрыцці, толькі з гэтым пойдзеш далей за сваіх настаўнікаў, прынясеш больш карысці грамадству.

Вялікую дапамогу студэнтам у станаўленні іх як навуковых работнікаў аказваюць кантрольныя і курсавыя работы, практычныя і семінарскія заняткі. Яны вучаць студэнтаў правільна валодаць моваи, коратка і лагічна выкладаць думкі. Бяда толькі, што некаторыя студэнты несур'ёзна ставяцца да кнігі, рыхтуючы выступленні, проста спісваюць даслоўна з яе цэлыя абзацы. Лянота думкі ніколі не вяла да поспеху. Трэба навучыць студэнта самастойна думаць з першага ж курса, арыентаваць яго на творчы падыход да тэмы, паказваць метады і спосабы навуковага доследу і іншае.

Неабходна таксама навучыць студэнтаў крытычна асэнсоўваць прачытаныя навуковыя працы і артыкулы — прывучыць іх да анатацый прачытанага, да таго, каб запісваць усё, што ўражвае — у кнігах, тэатры, кіно.

Часта ў газетах, часопісах і іншых выданнях натрапліваеш на цікавыя звесткі, прачытаеш, і... праз дзень-два забываеш. Буйнейшы савецкі вучоны А. С. Берг збіраў такі матэрыял і стварыў уласную энцыклапедыю. Чаму б і студэнту не пераняць такое. Быць энцыклапедычна эрудыраваным — да гэтага павінен імкнуцца кожны.

Нялёгкі шлях у навуку. Але галоўнае — гэта сістэма і праца, вялікая і герaічная, а таксама шчырае жаданне стаць карысным для нашага грамадства — лепшага грамадства на Зямлі.

В. Г. ЗАЎРЫЕЎ,
доктар, прафесар.

## У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ—ПАРТГРУПА

Партком універсітэта стварыў камісію, якая азнаёмілася з работай студэнцкіх партыйных груп гістарычнага факультэта. У адпаведным рашэнні было адзначана, што ў цяперашні час тут працуе 5 студэнцкіх партыйных груп, якія аб'ядноўваюць 60 камуністаў.

Большасць з іх паказвае прыклад у вучобе, побыце і толькі студэнты Баско, Хоміч, Тарасаў атрымалі ў час летняй сесіі здавальняючыя адзнакі. Драздоў і Таболаў доўгі час не маглі выправіць двоек.

У ходзе праверкі высветлілася, што ўсе камуністы факультэта маюць грамадскія даручэнні, кантроль за іх выкананнем, вядзе партыйнае бюро факультэта. Парторгі маюць «Дзённікі» са штомесячнымі планамі работы. Рэгулярна праводзяцца сходы, на якіх галоўным пытаннем заўсёды застаецца вучоба камуністаў.

Партыйнае бюро факультэта арганізоўвае семінары партгрупоргаў. Апрача гэтага члены бюро прысутнічаюць на сходах груп, а партгрупоргі — на сходах партыйнага бюро. Такая практыка дае добры плён.

**Для далейшага палепшання работы камісія ўнесла прапановы:**

Стварыць партыйную групу аспірантаў.

Кіраўніцтву факультэта і гаспадарчай часткі палепшыць дастаўку газет і часопісаў у студэнцкі інтэрнат.

Расшырыць вучобу маладых камуністаў, дабіцца, каб усе яны былі прыкладам у вучобе і побыце.



Уважліва перагортваюць старонку за старонкай студэнтка V-га курса матфака Валя Фрыдман і першакурснік юрфака Эдуард Шацкі.

## КРАСАМОЎСТВА ЛІЧБАЎ

72 мільёны савецкіх людзей маюць няпоўную сярэднюю і вышэйшую адукацыю. Спецыялістаў з закончанай вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй у канцы 1964 года было ў СССР 16,2 мільёна чалавек, у той час, як у царскай Расіі ў 1913 годзе мелася іх усяго 290 тысяч.

У Казахстане, Кіргізіі, Узбекістане, Таджыкістане і Туркменіі пры царызме адукаваных было лічаныя адзінкі. Цяпер жа на 10 тысяч жыхароў гэтых рэспублік прыходзіцца 92 студэнты (у той час, як у Францыі — толькі 40, у Італіі — 34 і ФРГ — 31).

Трэцяя частка насельніцтва СССР (калі не лічыць дзяцей дашкольнага ўзросту) вучыцца. Усяго гэта 68 мільёнаў. Такіх лічбаў не ведае ні адна капіталістычная краіна.

У нашых агульнаадукацыйных школах навучаецца амаль 47 мільёнаў чалавек.

У вышэйшых і сярэдніх спецыяльных установах цяпер больш як 6,9 мільёна чалавек. Пры гэтым без адрыву ад вытворчасці ў вну вучыцца больш 2-х мільёнаў, у тэхнікумах—1,7 мільёна.

Каля 70 працэнтаў студэнтаў дзённых аддзяленняў нашых вну атрымліваюць стыпендыю. 800 мільёнаў рублёў адведзена на яе ў 1965 годзе. І, як вядома, школа ў нас няплатная.

У нашай краіне 754 вну, сярод іх 40 універсітэтаў.

Па дадзеных ЮНЕСКА, каля 700 мільёнаў чалавек ва ўзросце ад 15 год не мае адукацыі. 200 мільёнаў дзяцей — амаль палова дзяцей школьнага ўзросту на зямным шары — не маюць магчымасці вучыцца.

*Насустрач выбарам*

# НАШЫ КАНДЫДАТЫ

**Вялікая работа праароблена ў нашым універсітэце насустрач выбарам народных суддзяў у агіткалектыве выбарчага ўчастка № 1 (кіраўнік Ул. Беркаў). Асаблівай стараннасцю вызначыліся агітатары Ева Саўчук, Нэля Густоўская, Мікалай Лескавец, Уладзімір Шурмоўскі і іншыя.**

**У кожны чацвер для выбаршчыкаў арганізоўваюцца юрыдычныя кансультанцыі, праводзяцца гутаркі аб савецкай выбарчай сістэме, а ў суботнія дні— паказваюцца кінафільмы.**

**7-га снежня выбаршчыкі сустрэнуцца са сваімі кандыдатамі ў народныя суддзі. Ужо сталі вядомы іх імёны. Гэта — П. Д. Багдановіч, М. М. Германовіч, А. І. Новікава, якія вылучаны калектывамі Белпрампраекта, Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя Ул. І. Леніна, мотавелазаводам, заводам аўтаматычных ліній, Паштамта, Міністэрства сувязі БССР і Беларускага дзяржаўнага інстытута народнай гаспадаркі.**

**ПЯТРО ДЗМІТРАВІЧ БАГДАНОВІЧ нарадзіўся ў 1918 годзе ў сяле Красніца, Рагачоўскага раёна, Гомельскай вобласці. Свой працоўны шлях ён пачаў у Рыбінску ў механічных майстэрнях. У час Вялікай Айчыннай вайны Пятро Дзмітравіч знаходзіўся на фронце. Узнагароджан трыма ардэнамі. Скончыў Харкаўскі юрыдычны інстытут, працаваў у партыйных органах і органах юстыцыі. З 1957 года працуе народным суддзёй Кастрычніцкага раёна горада Мінска, затым мінскага сельскага раёна.**

**МІХАІЛ МІХАЙЛАВІЧ ГЕРМАНОВІЧ нарадзіўся ў 1937 годзе ў вёсцы Зелькаўцы, Ваўкавыскага раёна, Гродзенскай вобласці. Скончыў Мінскае тэхнічнае вучылішча, працаваў фармаўшчыком на трактарным заводзе. Пасля службы ў Савецкай Арміі завочна вучыцца на юрыдычным факультэце нашага універсітэта. З'яўляючыся народным засядацелем Мінскага абласнога суда, ён неаднаразова выконваў даручэнні па складаных крымінальных і грамадзянскіх справах і праявіў сябе здольным юрыстам.**

**АЛЕНА ІВАНАЎНА НОВІКАВА нарадзілася ў 1924 годзе ў Харкаве. Скончыла яна Мінскі юрыдычны інстытут. У 1951 годзе яе абралі народным суддзёй Кастрычніцкага раёна горада Мінска, а ў 1960 годзе — Ленінскага раёна. За гэты час Алена Іванаўна праявіла сябе дысцыплінаваным, удумлівым работнікам, ініцыятыўным і патрабавальным суддзёй.**

**Няма сумнення ў тым, што выбаршчыкі нашага ўчастка № 1 аднадушна аддадуць свае галасы за кандыдатаў у народныя суддзі т. т. Багдановіча, Германовіча і Новікаву.**

**І. ШПАДАРУК.**

## *СПРЭЧКА ІДЗЕ*

□ □ □

ПІСЬМО тваё, Віталій, мне спадабалася. Хочацца пазнаёміцца з табой бліжэй—аднадумцы мы. Я таксама кругленькі, як кажуць, троечнік пяты гадок... Дыплом хутка выдадуць такі, як і астатнім — там не напісана — «пяцёрачнік» я ці «троечнік». Арыгінальна нехта прыдумаў.

Хутка бягуць дзянькі. Некаторыя ўжо мае суседзі па ложку, не-не ды і спрабуюць не выключыць святло пасля 12 гадзін вечара. Але падніму такі хвалт—выключаць! Адпачыць жа мне трэба. Дня ім мала! Дзе там тая сесія, а ўжо сядзяць, сагнуўшыся ў крук, дзень у дзень. Бегаюць, мітусяцца — грамадская работа ці дыпломная падганяе іх? Не ведаю.

Я дык яшчэ ні за што не браўся. Паспею. Выкладчыкі ў нас, Віталій, цудоўныя, ніжэй тройкі не паставяць. Ёсць яшчэ пры камітэце камсамола акадэмічны сектар: нідзе не дзенецца, і ён за тое, каб двоек не было. Адным словам, нянек хапае. Але я і сам не праморгваю. Дыпломную выбраў лёгкую.

Некаторыя нават нейкі расклад рабочага дня прыдумалі. Хохма? А мяне пасля 9 вечара і да 9 раніцы—не кантуй, сплю.

— Хоць і апошняя, але цяжкая цяпер у нас сесія будзе. І цяпер я мару, як аб найбольшым шчасці, здаць яе хоць бы на троечкі. Абы здаць!..

Згодзен з табой, Віталій; з тройкай не прападзеш. А куратар нават сказаў пра мяне аднойчы: «Навука даецца хлопцу з цяжкасцю, але стараецца, малайчына!»

Шкада, што ты, Віталій, не назваў сваё прозвішча. Давай сустрэнемся ў суботу ў вестыбюлі галоўнага корпуса: там, дзе стэнд з выдатнікамі. Чакаю пасля першага званка. У нас будзе аб чым пагаварыць.

**Іван.**

□ □ □

СКАЖУ па шчырасці, Віталій, мяне вельмі здзівіла тваё самазаспакаенне. Ты задаволены, што ў цябе тройкі, і мець адзнакі вышэй яе ты не імкнешся. На маю думку, галоўнае— веды.

Сярод маіх знаёмых студэнтаў ёсць розныя па характару, звычках і паводзінах людзі, амаль усе яны імкнуцца як мага больш паглыбіцца ў навуку, усіх іх цікавяць шматлікія пытанні нашага жыцця, побыту. Яны часта спрачаюцца аб цяжкасцях, якія часам сустракаюцца і ў студэнта. Ды не ўсе з іх, як мне здаецца, знаходзяць правільны шлях да пазнання непазнанага. Адны лічаць за лепшае пайсці ў бібліятэку, узяць любую цікавую кнігу і прасядзець там цэлы вечар. Іншыя прыходзяць у кабінет ці бібліятэку чытаць толькі тое, што патрэбна па праграме. Каб толькі здаць на экзаменах. Яны, вядома, заўсёды і акуратна рыхтуюцца да семінарскіх заняткаў. Прызнаюць адзнаку толькі «выдатна». А здарыцца іншы раз так, што атрымаюць «чацвёрку» ці нават «тройку»—перажываюць гэта цяжэй любой хваробы, ідуць здаваць другі раз, каб толькі дабіцца свайго. Гэтыя людзі, вядома, не шкадуюць ні сябе ні часу для навукі. Дарэчы, некаторыя з іх нават рэдка ходзяць у кіно, тэатр, бо гэта адымае час ад вучобы. Правільна робяць яны ці не, але поспехі ў іх выдатныя.

Ды вось студэнты парашылі правесці паміж курсамі спартыўнае спаборніцтва. Першая надзея на выдатнікаў. Але ім... не да спорту. Запісваем у мастацкую самадзейнасць. Яны зноў: «Не спяваю, не танцую».

«Вучоны сухар, ты!» — гавораць тады пра такіх, і ці гэта не праўда?

Я дык люблю студэнтаў іншага складу. На перапынках яны ажыўлена спрачаюцца. Пасля лекцый бягуць па сваіх грамадскіх справах. Іх можна сустрэць усюды — і ў камітэце камсамола, і ў мастацкай самадзейнасці, і на вечары, і ў кіно, тэатры, у спартыўнай зале. І вучацца яны таксама на выдатна і добра. Характэрна, што яны не любяць зубрыць, як першыя, але калі параўнаць веды і тых і другіх, перавага будзе не за зубрыламі.

Можа, давайце не хваліцца той ці іншай ацэнкай, а рыхтаваць з з сябе вартасных спецыялістаў. Думаць аб справе, а пяцёркі і чацвёркі прыйдуць самі.

Зразумей мяне, Віталій!

І наогул, калі ты хочаш спрачацца, давай у адкрытую. Маё прозвішча

**Ю. АГАРАДНІЧЭНКА, студэнт.**

# ТВАЁ СВЯТА, АФРЫКА!

## НАРОД ПЕРАМОЖА

Наша партыя—Афрыканская партыя незалежнасці Гвінеі і астравоў Зялёнага Мыса—вядзе ўпартую барацьбу супраць партугальскіх каланізатараў. І яна будзе працягваць яе да той пары, пакуль народ не прагоніць усіх партугальскіх прыгнятальнікаў. Гарматы і самалёты, карныя экспедыцыі і напалмавыя бомбы выкарыстоўваюць яны супраць нас. Але мы ніколі не адмовімся ад свяшчэннай барацьбы за свабоду нашай шматпакутнай бацькаўшчыны. Мы заўсёды будзем змагацца супраць імперыялізма, за дэмакратыю, а затым і пабудову камуністычнага грамадства ў нашай краіне.

Партугальцы на працягу больш пяці стагоддзяў уладарнічаюць у Гвінеі і на астравах Зялёнага Мыса. Сёння наш народ арганізавана ўзяўся за зброю і пачаў рэвалюцыйную барацьбу супраць каланіяльнага ярма, за ўсталяванне на нашай зямлі міру і справядлівасці. Нядаўна група змагароў за вызваленне Гвінеі пад кіраўніцтвам камандзіра Ніно Віейра зрабіла налёт на адзін з ваенных штабоў каланізатараў, узарвала яго, захапіўшы вялікую колькасць зброі і чатырох салдат каланізатарскай арміі.

У рашучай барацьбе супраць партугальскіх каланізатараў наш народ выйдзе пераможцам. Мы і больш ніхто не будзе гаспадаром сваёй зямлі! Нашых багаццяў ніхто не павінен адбіраць у нас! У сваёй барацьбе і перамозе наш народ перакананы, бо ён змагаецца не адзін, на яго баку ўсе прагрэсіўныя народы свету!

З выпадку Дня Афрыкі я і мой сябра Эўрыке Барбоза, з якім мы цяпер займаемся на падрыхтоўчым факультэце універсітэта, шлём гарачае прывітанне ўсім афрыканскім, савецкім, в'етнамскім і кубінскім студэнтам.

**Сальвадор Насія,**
**студэнт з «Партугальскай» Гвінеі.**



*— У гэтым месцы, — паказвае алоўкам студэнт з «Партугальскай» Гвінеі Сальвадор Насія Эўрыку Барбозу, — некалькі дзён таму назад група змагароў за свабодную Гвінею зрабіла ўдалы налёт на штаб каланізатараў...*

Фота Ул. БУДАЯ.

# С'ЕРА-ЛЕОНЕ—НАША РАДЗІМА

Маленькая, але цудоўная краіна С'ера-Леоне ёсць у Заходняй Афрыцы. Гэта наша Радзіма.

З Ліберыяй і Гвінеяй мяжуе яна, Атлантычны акіян амывае яе. Шмат прыгожых гаваняў страчае параходы з усіх куткоў свету. На нашай зямлі растуць кафейныя дрэвы, какосавыя пальмы. А ў нетрах—алмазы, золата, жалезная руда, баксіты. Сталіца С'ера-Леоне—Фрытаун знаходзіцца на ўзбярэжжы Атлантычнага акіяна. Гэта прыгожы і вялікі горад, тут шмат фабрык, заводаў. Фрытаун электрыфіцыраван, мае тэлевізійную студыю, а цяпер хуткімі тэмпамі будуецца ў ім гідраэлектрастанцыя. Ёсць у нас шмат і іншых вялікіх гарадоў—Бо, Кенема, Каіду, Максні.

У нашай сталіцы знаходзіцца універсітэт, які называецца «Фоура Бей каледж». У ім атрымлівае адукацыю не толькі моладзь з С'ера-Леоне, але і з іншых афрыканскіх краін і нават з Еўропы. У горадзе Нджала ёсць яшчэ адзін універсітэт, у якім рыхтуюцца кадры для сельскай гаспадаркі.

У нас многа сярэдніх школ, дзе вучыцца большая частка моладзі нашай краіны.

Доўгі час С'ера-Леоне была пад прыгнётам Англіі. Упартай барацьбой мы дабіліся самастойнасці толькі ў 1961 годзе. На нашым нацыянальным сцягу тры колеры: зялёны, белы, блакітны. Зялёны — сімвал гаспадаркі краіны, белы—міру, блакітны — мора.

У нашым краі жыве каля трох мільёнаў чалавек, якія размаўляюць на пятнаццаці розных мовах. Агульная мова крыольская.

Прэм'ер-міністрам з'яўляецца Альбарт Маргай. Гэта добры правадыр, які шмат працуе для народа і развіцця краіны. Насельніцтва любіць яго.

Цяпер мы вучымся ў Савецкім Саюзе, часта размаўляем з савецкімі студэнтамі. Мы заўсёды расказваем ім пра сваю краіну. І марым пра яе будучыню, якая, нам здаецца, будзе шчаслівай.

Нам прыемна адзначыць, што універсітэт імя У. І. Леніна рыхтуе добрых спецыялістаў, і мы будзем дапамагаць будаваць у С'ера-Леоне новае жыццё.

**Ад імя ўсіх студэнтаў С'ера-Леоне прэзідэнт іх Зямляцтва Камара Саламі Самба.**

**Рэдактар А. ЛОЙКА.**

**Рэктарат, партком, мясцком універсітэта са спачуваннем паведамляюць, што пасля працяглай цяжкай хваробы памёр дацэнт А. Я. БІРАЛА.**

**Дэканат, партбюро і прафбюро філфака паведамляюць аб смерці А. Я. БІРАЛЫ і ад імя студэнтаў, супрацоўнікаў і выкладчыкаў факультэта выражаюць спачуванне сям'і памёршага.**

**Калектыў кафедры рускай мовы і агульнага мовазнаўства паведамляюць аб смерці загадчыка кафедры дацэнта А. Я. БІРАЛА і выказваюць спачуванне сям'і нябожчыка.**

**Калектыў кафедры гісторыі філасофіі і логікі выказвае спачуванне дацэнту кафедры А. А. Біралу з поваду смерці яго бацькі А. Я. БІРАЛЫ.**

## БІРАЛА
## Афанасій Якаўлевіч

**На 62 годзе жыцця памёр член КПСС з 1940 г., дацэнт кафедры рускай мовы і агульнага мовазнаўства універсітэта Афанасій Якаўлевіч Бірала.**

**Сваю працоўную дзейнасць ён пачаў з 18 гадоў, быў настаўнікам пачатковай школы, выхавацелем дзіцячага дома. У 1929 г. скончыў БДУ, а ў 1944 аспірантуру пры Уральскім дзяржаўным універсітэце. Праз два гады ім была абаронена кандыдацкая дысертацыя.**

**З 1951 г. А. Я. Бірала працаваў у нашым універсітэце загадчыкам кафедры рускай мовы і агульнага мовазнаўства.**

**Афанасій Якаўлевіч Бірала быў чулым і спагадлівым чалавекам, эрудыраваным педагогам і ўдумлівым вучоным. Ён прымаў удзел у напісанні падручнікаў па гісторыі беларускай мовы і сучаснай беларускай мове, напісаў шмат артыкулаў па пытаннях мовазнаўства. Яго шматлікія вучні працуюць у школах і ВНУ рэспублікі.**

**Светлая памяць аб Афанасіі Якаўлевічы Біралу назаўсёды застанецца ў нашых сэрцах.**

**ГРУПА ТАВАРЫШАЎ.**

АТ 03562 **Адрас рэдакцыі: г. Мінск, БДУ імя Ул. І. Леніна, галоўны корпус, п. 212, тэл. 2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда». Зак. 1313**